(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

УДК 947.6: 33

Доўнар Людміла Аляксандраўна

# Дзяржаўная палітыка ў сферы прыватнай прамысловай вытворчасці БССР (1921-1929 гг.)

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07. 00. 02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2007

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Праца выканана ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Навуковы кіраўнік: **Сакалоў Мікалай Канстанцінавіч,**
доктар гістарычных навук,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі
установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Афіцыйныя апаненты: **Касцюк Міхаіл Паўлавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
акадэмік НАН Беларусі, загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі XX ст.
дзяржаўнай навуковай ўстановы "Інстытут гісторыі НАН Беларусі"

**Галубовіч Валерый Іванавіч,**
кандыдат гістарычных навук, прафесар кафедры эканамічнай гісторыі установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"

Апаніруючая арганізацыя: установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

Абарона адбудзецца 23 лютага 2007 г. у 16.30 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02. 21. 03 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд 482; bagdanovich.sovet@tut.by; тэл. 200-82-53.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка."

Аўтарэферат разасланы «    » студзеня 2007 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый І. І. Багдановіч

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Даследаванне з'яўляецца часткай навуковай праблемы "Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.", якая распрацоўвалася кафедрай гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" ў рамках праграмы фундаментальных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь "Даследаванне гісторыі мастацтва, сацыяльных, этна-культурных традыцый Беларусі ў кантэксце славянскай культуры, еўрапейскай цывілізацыі, глабальнага развіцця і этна-канфесіянальных працэсаў у сучасным свеце" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 2006425). Тэма даследавання зацверджана на Вучоным Савеце БДПУ (пратакол № 6 ад 27.02.03 г.).

**Мэта і задачы даследавання.**

Мэтай даследавання з'яўляецца навуковая ацэнка ўплыву дзяржаўнай палітыкі на развіццё прыватнай прамысловай вытворчасці БССР у 1920-я гг. Задачы даследавання:

– прааналізаваць стан навуковай распрацоўкі і вызначыць інфармацыйную базу для даследавання адзначанай праблемы;

– раскрыць асноўны змест сацыяльнай, падатковай і крэдытнай палітыкі савецкай дзяржавы як інструмента рэгулявання дзейнасці прыватных прамысловых прадпрыемстваў;

– выявіць колькасць, спецыялізацыю і ўзровень развіцця прыватных прамысловых прадпрыемстваў у БССР;

– вызначыць умовы існавання і рэгіянальныя асаблівасці прыватнай прамысловай вытворчасці Беларусі.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца палітыка савецкай дзяржавы ў сферы прыватнай вытворчасці ў БССР ва ўмовах шматукладнай эканомікі ў перыяд НЭПа. Прадметам даследавання з'яўляецца прыватная прамысловасць БССР у 1921–1929 гг.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Прыватная вытворчасць БССР у перыяд НЭПа з'яўляецца маладаследаванай праблемай, хоць гісторыкі і эканамісты ў сваіх манаграфіях і публіцыстычных артыкулах падкрэслівалі важнасць гэтай тэмы для вывучэння гаспадарчага становішча краіны ў 1920-я гг. Асноўнымі крыніцамі даследавання палітыкі савецкай дзяржавы ў сферы прыватнай прамысловай вытворчасці БССР былі пастановы і рашэнні партыйных і дзяржаўных органаў, статыстычныя матэрыялы аб гаспадарчай дзейнасці прыватных прамысловых прадпрыемстваў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

2. Пры пераходзе да НЭПа змянілася стаўленне савецкай дзяржавы да прыватнай вытворчасці, яе развіццё стала разглядацца як важны сродак пераадолення эканамічных цяжкасцей у краіне. Прыватныя вытворцы маглі забяспечыць насельніцтва краіны таварамі шырокага ўжытку, садзейнічаць змяншэнню ўзроўню беспрацоўя і падлеткавага беспрытульніцтва. Таму ў перыяд 1921–1924 гг. дзяржава стварыла спрыяльныя ўмовы для прыватнага капіталу ў прамысловасці. У сярэдзіне 1920-х гг. савецкая дзяржава перайшла да палітыкі ўзмацнення эканамічнага ціску на ўладальнікаў прыватных прадпрыемстваў праз сацыяльна-прававыя абмежаванні, змены ў сістэме падаткаабкладання і крэдытавання. З 1927 г. дзяржаўная палітыка мела кірунак на выцясненне прыватнага капіталу з эканомікі краіны, што прывяло да значнага памяншэння колькасці прыватных прадпрыемстваў. Такім чынам, пераход ад падтрымкі прадпрымальніцтва да выцяснення прыватнага капіталу ў канцы 1920-х гг. азначаў адмову ад прынцыпаў НЭПа.

3. У 1921–1924 гг. адбываўся рост колькасці прыватных прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі БССР. Большасць іх уладальнікаў адносілася да саматужнікаў, у прыватнай вытворчасці актыўна выкарыстоўвалася наёмная праца. Асноўнымі галінамі вытворчасці былі дрэваапрацоўчая, харчовая і гарбарная. Перыяд з 1925 па 1926 г. характарызаваўся спадам вытворчасці на прыватных прадпрыемствах. Большасць прыватных вытворцаў складалі рамеснікі, якія спецыялізаваліся на кравецкім і шавецкім промыслах. У 1927–1928 гг. адбылося рэзкае памяншэнне агульнай колькасці прыватных прадпрыемстваў амаль ва ўсіх галінах прамысловасці.

4. У БССР у перыяд НЭПа значная частка прамысловай прадукцыі выраблялася на прыватных прадпрыемствах. Найбольш распаўсюджанымі заняткамі прыватных вытворцаў з'яўляліся шавецкі і кравецкі промыслы. На самым высокім узроўні развіваліся прыватныя гарбарныя, смалакурныя і мукамольныя прадпрыемствы.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Прапанаваная дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай працай па даследаванні малавывучанай праблемы становішча прыватнага капіталу ў прамысловасці БССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі. Дысертацыя напісана на аснове архіўных крыніц, упершыню ўведзеных у навуковы ўжытак, звестак перыядычнага друку 20-х гг., матэрыялаў эканамічнай і гістарычнай літаратуры.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Палажэнні і вывады дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі і на навуковым семінары гістарычнага факультэта БДПУ імя М. Танка. Матэрыялы і вынікі даследавання былі выкладзены на навуковых канферэнцыях: "Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
настаўнікаў XXI ст." (Мінск, 2003) і "Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты "Наша ніва" (Мінск, 2006).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Дысертантам апублікавана 8 артыкулаў агульным аб'ёмам 3,1 аўтарскія аркушы, у тым ліку 3 артыкулы змешчаны ў рэцэнзуемых часопісах, 3 – у зборніках навуковых прац і 2 – у тэзісах дакладаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Структура дысертацыі абумоўлена пастаўленымі задачамі і ўключае ўводзіны, агульную характарыстыку працы, асноўны змест, які складаецца з трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і 6 статыстычных дадаткаў. Поўны аб'ем дысертацыі складае 140 старонак, з іх бібліяграфічны спіс займае 21 старонку, дадаткі змешчаны на 15 старонках.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

**Глава 1. Аналітычны агляд літаратуры і крыніц.** Вывучэнне прыватнай вытворчасці ў час правядзення новай эканамічнай палітыкі ўмоўна падзяляецца на тры храналагічныя перыяды.

Першы перыяд – 1920–1930-я гг. прадстаўлены працамі эканамістаў, якія мелі магчымасць глядзець на яе вачыма сучаснікаў, таму іх меркаванні атрымалі каштоўнасць гістарычных першакрыніц. Яны імкнуліся выявіць тагачаснае становішча і перспектывы развіцця прыватных прадпрыемстваў для сацыялістычнага будаўніцтва.

Для эканомікі Беларусі прыватная вытворчасць мела большае значэнне, чым для эканомікі большасці іншых рэспублік СССР. Таму ў названы перыяд з'явілася даволі шмат манаграфій і артыкулаў беларускіх эканамістаў, прысвечаных дадзенай праблеме. У прыватнасці, Я. Смірноў[1] выявіў тэндэнцыі павелічэння абаротаў прыватнай вытворчасці і зніжэння абаротаў дзяржаўнай прамысловасці ў перыяд 1922–1923 гг. Л. Аўхімень[2] звярнуў увагу на тое, што прамысловасць Беларусі ў сярэдзіне 1920-х гг. на 95% была прыватнаўласніцкай. Праблему сацыяльнага становішча ўладальнікаў прыватных прадпрыемстваў узняў А. Арцімовіч.[3] У залежнасці ад узроўню арганізацыі вытворчага працэсу на прыватным прамысловым прадпрыемстве, яго ўладальнік лічыўся рамеснікам, саматужнікам ці прамыслоўцам.

У Беларусі вывучалася дзейнасць асобных галін прыватнай вытворчасці. Найбольшая ўвага надавалася смалакурням, гарбарням і млынам. Іх становішча і перспектывы развіцця разглядаліся ў артыкулах М. Карклiна, В. Натсана, Г.

[1] Смирнов, Я. Состояние оборотов торговых и промышленных предприятий в Беларуси 1923/1924 гг. / Я. Смирнов // Савецкае будаўніцтва. – 1924. –№ 1. – С. 14 – 25.
[2] Аўхімень, Л. Эканамічны нарыс БССР. / Л. Аўхімень. – Мінск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 226 с.
[3] Арцимович, А. К вопросу о признаках ремесленного и кустарного производства как единицы наблюдения в промышленной статистике / А. Арцимович // Працы БДУ. – 1928. – № 20. – С. 12– 21.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

праводзілася ў адносінах да вытворчага прадпрымальніцтва ў перыяд НЭПа, дазволіла толькі аднавіць прыватную прамысловасць на даваенным узроўні, але не стварыла ўмоў для яе далейшага развіцця. Самым спрыяльным для функцыянавання прыватных прадпрыемстваў быў перыяд з 1921 па 1924 г. Прыватная вытворчасць насіла пераважна саматужны характар і мела важнае значэнне ў гаспадарчым жыцці краіны. У 1925–1926 гг. савецкая ўлада не дапусціла якаснага ўзмацнення прыватных прадпрыемстваў. У Беларусі яны пачалі насіць пераважна рамесны характар. Актыўная палітыка выцяснення прыватнага капіталу з эканомікі пачалася з 1927 г., хоць аб'ектыўных эканамічных перадумоў для гэтага не існавала. Памер падаткаў на прадпрымальнікаў быў рэзка павышаны, крэдытаванне спынена, стала цяжка атрымаць сыравіну. Бар'ерамі на шляху далейшага развіцця прыватнай вытворчасці сталі ўскладненне бюракратычнай працэдуры заснавання вытворчага прадпрыемства прыватнай асобай, узмацненне інспектарскага кантролю за дзейнасцю прадпрыемства, рэгламентацыя цэн на гатовую прадукцыю. У такіх умовах прадпрымальнікі перасталі займацца вытворчасцю. Гэта быў вынік супярэчнасці паміж манапольнай структурай улады і дэмакратычнымі тэндэнцыямі развіцця рыначнай эканомікі. Палітычныя мэты савецкай дзяржавы выключалі магчымасць далейшага развіцця прыватнага сектара эканомікі [5, 6].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання**

Вынікі даследавання дазволілі пашырыць і канкрэтызаваць веды пра прыватую вытворчасць БССР у перыяд НЭПа. Фактычны і статыстычны матэрыял, які ўтрымліваецца ў дысертацыі, можа быць выкарыстаны ў лекцыйных курсах па гісторыі Беларусі, эканамічнай гісторыі БССР, спецкурсах краязнаўчай тэматыкі, а таксама пры напісанні падручнікаў і дапаможнікаў.

У гісторыі беларускай дзяржавы ёсць уласны вопыт развіцця прадпрымальніцтва, які даказаў, што прыватны сектар эканомікі здольны вырашаць маштабныя эканамічныя праблемы. Гэты вопыт мэтазгодна ўлічваць у сучасны перыяд. Ён дазволіць выкарыстаць усе перавагі вытворчага прадпрымальніцтва і пазбегнуць памылак у справе дзяржаўнага рэгулявання прыватнай вытворчасцю.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы

1 Доўнар, Л. А. Наёмная праца на прыватных прадпрыемствах Беларусі. / Л. А. Доўнар // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследвання: зб. навук. арт. / БДПУ; рэд. Каранеўская Л. М. –Мінск, 2004. – С. 189 – 196.

2 Доўнар, Л. А. Падатковая палітыка савецкай дзяржавы ў адносінах да прыватнай вытворчасці ў першай палове 20 – х г. г. XX ст. / Л. А. Доўнар // Весці Беларускага Дзяржаўнага Педагагічнага Універсітэта. Сер. 2, Гісторыя, Філасофія, Паліталогія, Сацыялогія, Эканоміка, Культуралогія. – 2005. – № 1. – С. 49 – 53.

3 Доўнар, Л. А. Палітыка стымулявання кустарна – рамеснай вытворчасці ў Беларусі. / Л. А. Доўнар // Весці Беларускага Дзяржаўнага Педагагічнага Універсітэта. Серыя 2, Гісторыя, Філасофія, Паліталогія, Сацыялогія, Эканоміка, Культуралогія. – 2006. – № 1. – С. 19 – 23.

4 Доўнар, Л. А. Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці. / Л. А. Доўнар // Весці Беларускага Дзяржаўнага Педагагічнага Універсітэта. Серыя 2, Гісторыя, Філасофія, Паліталогія, Сацыялогія, Эканоміка, Культуралогія. – 2006. – № 4. – С. 38 – 42.

5 Доўнар, Л. А. Смалакурэнне ў Беларусі ў перыяд НЭПа. / Л. А. Доўнар // Новая и новейшая история Европы и Америки: проблемы, поиски, исследования: сб. науч. ст. / БГПУ; редкол. А. П. Житко [и др.]. – Минск, 2006. – С. 61 – 66.

6 Доўнар, Л. А. Гарбарная прамысловасць у Беларусі ў перыяд НЭПа. / Л. А. Доўнар // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: зб. навук. прац / редкол. А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. С. 18 - 23.

### Матэрыялы канферэнцый

7 Доўнар, Л. А. Дробнатаварная вытворчасць у Беларусі ў перыяд НЭПа. / Л. А. Доўнар // Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI ст.: матэрыялы рэсп. навук. - тэар. канф., Мінск, 6 снежня 2002 г. / БДПУ; рэдкал.:А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 60 – 62.

8 Доўнар, Л. А. Рамесная вытворчасць у сельскай мясцовасці ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / Л. А. Доўнар // Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты "Наша Ніва": матэрыялы рэсп. навук. – тэар. канф., Мінск. 10 лістапада 2006 г. / БДПУ; рэдкал.:І. І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 94 – 96.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



## РЭЗЮМЭ


Доўнар Людміла Аляксандраўна

**Дзяржаўная палітыка ў сферы прыватнай прамысловай вытворчасці БССР (1921-1929 гг.)**

**Ключавыя словы:** прыватная дробнатаварная вытворчасць, саматужнік, прамысловец, дзяржаўная палітыка, падаткі, крэдыт, НЭП.

**Аб'ект даследавання** – дзяржаўная палітыка ў адносінах да прыватнай прамысловай вытворчасці ў 1920-х гг.

**Прадмет даследавання** – прыватная прамысловасць БССР у 1921– 1929 гг.

**Мэта даследавання** – навуковая ацэнка дзяржаўнага ўплыву на прыватную прамысловую вытворчасць БССР у перыяд НЭПа.

**Метады даследавання.** Дысертацыя грунтуецца на асноўных метадалагічных прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму. Выкарыстаны метады тэорыі гістарычнага пазнання: аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна** заключаецца ў комплексным аналізе заканадаўчых актаў цэнтральных і мясцовых органаў савецкай улады, якія тычыліся рэгулявання вытворчага прадпрымальніцтва і дазволілі ацаніць ступень уплыву дзяржавы на дзейнасць прыватных вытворчых прадпрыемстваў. Аўтарам былі даследаваны малавывучаныя праблемы функцыянавання прыватнага капіталу ў прамысловасці БССР у перыяд 1921-1929 гг. Вывады, сфармуляваныя ў заключэнні, дазволілі пашырыць навуковае ўяўленне пра эканамічнае становішча Беларусі ў 20-х гг. XX ст. У навуковы ўжытак былі ўведзены новыя архіўныя дакументы і статыстычныя данныя, што таксама з'яўляецца элементам навізны.

**Тэарэтычнае значэнне** працы заключаецца ў раскрыцці з дапамогай сучаснай металалогіі і метадаў даследавання асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да прыватнай вытворчасці ў прамысловасці БССР у 20-х гг. XX ст.

**Практычнае значэнне** атрыманых вынікаў заключаецца ў магчымасці выкарыстоўваць фактычны і статыстычны матэрыял, які ўтрымліваецца ў дысертацыі, у лекцыйных курсах па гісторыі Беларусі, гісторыі эканомікі БССР, спецкурсах краязнаўчай тэматыкі, а таксама пры напісанні падручнікаў і дапаможнікаў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЕЗЮМЕ


Довнар Людмила Александровна

**Государственная политика в сфере частного промышленного производства БССР (1921-1929 гг.)**

**Ключевые слова:** частное мелкотоварное призводство, кустарь, промышленник, государственная политика, налоги, кредит, НЭП.

**Объект исследования** – государстенная политика относительно частного промышленного производства в БССР в 1920-е гг.

**Предмет исследования** – частное производство БССР в 1921-1929 гг.

**Цель исследования** – научная оценка государственного воздействия на частное промышленное производство в БССР в период НЭПа.

**Методы исследования.** Диссертация базируется на основных методологических принципах объективности и историзма, использованы методы теории исторического познания: анализ, синтез, индукция, дедукция и специально-исторические методы: историко-сравнительный, историко-типологический, статистического анализа.

**Научная новизна** заключается в комплексном анализе законодательных актов центральных и местных органов советской власти, которые касались регулирования производственного предпринимательства. Это позволило оценить степень воздействия государства на деятельность частных производственных предприятий. Автором были исследованы малоизученные проблемы функционирования частного капитала в промышленности БССР в 1921–1929 гг.. Выводы, сформулированные в заключении, позволили расширить научное представление об экономическом положении Беларуси в 20-х гг. XX ст. В научный оборот были введены новые архивные документы и статистические данные, что также является элементом новизны.

**Теоретическое значение** работы заключается в раскрытии с помощью современной методологии и методов исследования основных направлений государственной политики относительно частного производства в БССР в 20-е гг. XX в.

**Практическое значение** полученных результатов заключается в возможности использовать фактический и статистический материал, который содержится в диссертации, для лекционных курсов по истории Беларуси, истории экономики БССР, спецкурсах краеведческой тематики, а также при написании учебников и учебных пособий.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## SUMMARY

Dovnar Ludmila Aleksandrovna

**State policy concerning private manufacture of BSSR (1921-1929)**

**Keywords:** private small-scale production, handicraftsmen, industrialist, a state policy, taxes, credit, NEP.

**Object of study** - the state policy concerning private manufacture

**The subject of study** - the private manufacture of BSSR in 1921-1929

**The purpose of study** - to give a scientific evaluation of a state policy concerning private manufacture in BSSR

**The methods of study** the thesis is based on the main methodological principles of objectivity and a historicism, methods of the theory of historical cognitions are used: the analysis, synthesis, induction, deduction and special - historical methods: historical-and-comparative, historical-typological, the statistical analysis.

**Scientific novelty** consists in the complex analysis of acts of central and local authorities of the soviet rule which regulated the private industrial business. It has allowed estimating a degree of influence of the state on activity of the private industrial enterprises. The author investigated insufficiently studied problems of functioning of the private capital in industry in BSSR during the period of NEP. The conclusion has allowed expanding scientific representation about an economic situation of Belarus during the period of NEP. Majority of archival documents and statistical data were used in the science in the first time that also is an element of the novelty.

**The theoretical importance** of the work lies in disclosing the directions of the state policy concerning private manufacture in BSSR on the basis of modern methodology and methods of study.

**Practical importance** consists in an opportunity to use of the study results an actual and statistical material for lecture of economical history of BSSR, special courses of study of local lore subjects, and also at a spelling of textbooks, methodical reference books.